ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

21 ЛІСТАПАДА

ЧАЦВЕР

№ 31(1481)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

марксісцка-ленінскай філасофіі абмяркоўвалі студэнты-замежнікі ВНУ г. Мінска, якія прымалі ўдзел у традыцыйнай міжвузаўскай студэнцкай навуковай канферэнцыі, што адбылася ў БДУ. У рамках канферэнцыі «Марксісцка-ленінская філасофія — метад навуковага пазнання і сацыяльнага дзеяння» працавалі 3 навуковыя секцыі: дыялектычнага матэрыялізму, гістарычнага матэрыялізму і актуальных праблем сучаснага рэвалюцыйнага руху. На секцыях было заслухана і абмеркавана больш чым 40 тэарэтычных студэнцкіх дакладаў, прысвечаных актуальным праблемам асэнсавання сучаснага рэвалюцыйнага працэсу, даследаванню заканамернасцей развіцця сусветнай сістэмы сацыялізма, вывучэнню сучасных экалагічных і дэмаграфічных праблем, аналізу пытанняў матэрыялістычнай дыялектыкі і марксісцка-ленінскай тэорыі пазнання. Кіраўнікі секцый дацэнты А. П. Ждаsuccession… 

Аўтары найбольш глыбокіх і змястоўных дакладаў, апрабіраваных на гэтай канферэнцыі, былі адзначаны Ганаровымі дыпломамі МінВНУ БССР.

М. МАЖЭЙКА.

### ЛЕПШЫ ПАКОЙ

вызначаны па выніках сацыялістычнага спаборніцтва паміж інтэрнатамі універсітэта. Пераможцамі выйшлі: у інтэрнаце № 1 — калектыў пакоя № 6 (староста Л. Кудласевіч), № 2 — 703б (староста Т. Траццяк), № 3 — 1013б (староста Л. Каланчэнка), № 4 — 433 (староста А. Валовік), № 6 — 819 (староста А. Лісай), № 7 — 912 (староста Л. Карсюк). Пераможцы заахвочаны каштоўнымі падарункамі.

П. ЛАПЦЕНАК.

### СУВЯЗІ БРАТЭРСТВА

і супрацоўніцтва звязваюць выкладчыкаў кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ імя У. І. Леніна з афганскімі студэнтамі. На працягу шэрагу гадоў кафедра ажыццяўляе куратарства афганскім студэнцкім зямляцтвам.

Адбыўся ўрачысты сход афганскіх студэнтаў сумесна з калектывам кафедры, прысвечаны 68-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У сходзе прынялі ўдзел афганскія студэнты, якія навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна, БТІ імя С. М. Кірава, МДМІ і БІНГ імя В. У. Куйбышава. З прамовай на сходзе выступіў намеснік кафедры гісторыі філасофіі і логікі па рабоце з замежнымі студэнтамі дацэнт В. І. Бартон.

Я. БАДРОЎ.

## XXVII з'езду КПСС — дастойную сустрэчу




## IV СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

# УМАЦОЎВАЦЬ СУВЯЗІ З ПРАКТЫКАЙ

**БОЛЬШ ЧЫМ УДВАЯ** ўзрос за пяцігоддзе эканамічны эфект ад укаранення ў вытворчасць распрацовак вучоных БДУ імя У. І. Леніна. Значна павялічана тут удзельная вага навуковых даследаванняў, якія выконваюцца па важных народнагаспадарчых праблемах. Расшыраюцца і паглыбляюцца сувязі ВНУ з прамысловымі прадпрыемствамі рэспублікі. Дзейнічаюць вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні БДУ — «Інтэграл», БДУ — «Планар», БДУ — «Гранат». Выпускнікі універсітэта паспяхова працуюць у многіх установах навукі і культуры, на вытворчасці.

Адказнасцю за падрыхтоўку высокакваліфікаваных, ідэйна перакананых кадраў, павелічэнне ўкладу ВНУ ў паскарэнне сацыяльна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага прагрэсу былі прасякнуты выступленні камуністаў на справаздачна-выбарнай партканферэнцыі, якая адбылася ў БДУ імя У. І. Леніна 12 лістапада.

Рэзерваў і нявыкарыстаных магчымасцей, як адзначалі дэлегаты, яшчэ нямала. У прыватнасці, партком па-сапраўднаму не патрабуе ад тых, хто адказвае за рэзультатыўнасць навучальна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы. Бо яшчэ нямала студэнтаў займаюцца на «здавальняюча». А за сценамі ВНУ маладым спецыялістам нярэдка не хапае практычных навыкаў, самастойнасці, ініцыятывы і прынцыповасці ў барацьбе з недахопамі.

Выступаўшыя адзначалі, што сёння, калі вядзецца работа па забеспячэнню усеагульнай камп'ютэрнай граматнасці, камуністы заклікаhandleны дабіцца, каб кожны выпускнік валодаў навыкамі прафесіянальнай дзейнасці на аўтаматызаваным рабочым месцы, з персанальнай ЭВМ. У сувязі з гэтым дэлегаты прапаноўвалі смялей пераходзіць з інфармацыйнага метаду навучання на праблемна-метадычнае, скарачаць аб'ём аўдыторных заняткаў і расшыраць рамкі самастойнай работы студэнтаў, іх спецыяльнай падрыхтоўкі на прамысловых прадпрыемствах, у навуковых установах.

Ва універсітэце марудна ўдасканальваецца планаванне даследаванняў. Гэта прыводзіць да дробнатэмнасці, распылення сіл і сродкаў. У выніку невялікая ўдзельная вага работ, выконваемых па саюзных, рэспубліканскіх і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграмах. Цяпер, як адзначаецца ў праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС, патрабуецца таксама паглыбленне інтэграцыі грамадскіх, прыродазнаўчых і тэхнічных навук.

На канферэнцыі выступіў першы сакратар ЦК КПБ М. М. Слюнькоў.

(БЕЛТА).

◆

Са справаздачным дакладам партыйнага камітэта выступіў прафесар М. І. Дзямчук. У спрэчках па дакладу выступілі: дацэнт фізічнага факультэта, сакратар партыйнага бюро В. А. Гайсёнак; дэкан юрыдычнага факультэта В. Г. Ціхіня; дырэктар НДІ ПФП А. Ф. Чарняўскі; дацэнт механіка-матэматычнага факультэта, старшыня камісіі па ажыццяўленню кантролю дзейнасці адміністрацыі М. Э. Талочка; сакратар камітэта камсамола універсітэта А. У. Казулін; дацэнт фізічнага факультэта, старшыня КНК універсітэта А. С. Каспяровіч; загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў У. К. Коршук; дацэнт біялагічнага факультэта, старшыня прафсаюзнага камітэта універсітэта У. Т. Шалатонін; рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі; дацэнт факультэта журналістыкі, сакратар партыйнага бюро Л. Ф. Шылава; токар СКТБ Л. А. Аркадзьеў; студэнтка V курса факультэта прыкладной матэматыкі Л. Панчанка.

Тэкст справаздачнага даклада партыйнага камітэта прапануем у скарачэнні на 2—3 старонках газеты.

# УМАЦОЎВАЦЬ СУВЯЗІ

IV СПРАВАЗДАЧНА-выбарная канферэнцыя камуністаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна праходзіць напярэдадні XXVII з'езда КПСС, калі па ўсёй краіне разгарнулася спаборніцтва за дастойную сустрэчу форума ленінскай партыі. Рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС, адобраныя на ім дакументы знаходзяцца зараз у цэнтры ўвагі нашага народа. Праект новай рэдакцыі партыйнай Праграмы. Асноўныя напрамкі сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны прасякнуты клопатам аб павышэнні ўзроўню жыцця савецкіх людзей, аб умацаванні эканамічнай, абароннай магутнасці і міжнародных пазіцый СССР, адказнасцю за лёс сусветнага сацыялізма, за мір ва ўсім свеце.

Ва універсітэце, як і па ўсёй краіне, ідзе абмеркаванне гэтых дакументаў. Камуністы, усе выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты ВДУ горача адабраюць праект новай рэдакцыі партыйнай Праграмы, уносяць прапановы па яго ўдасканаленню.

У сучасных умовах, падкрэсліваецца ў новай рэдакцыі Праграмы КПСС, неабходна далейшае ўдасканаленне падрыхтоўкі кадраў, павышэнне агульнай прафесійнай адукацыі.

Рашэнне новых задач, якія стаяць зараз перад намі, патрабуе ўнясення карэктыў у змест, формы і метады партыйнай работы. Неабходна глыбока ўсвядоміць выключную актуальнасць пастаўленых партыяй задач, нацэліць кожнага на актыўны ўдзел у перадз'ездаўскім сацыялістычным спаборніцтве, выяўленне рэзерваў росту на кожным рабочым месцы, выпрацаваць у людзей жаданне і ўменне мысліць і працаваць па-новаму.

Ажыццяўляючы падрыхтоўку спецыялістаў, даючы ім прафесійныя веды, неабходна ўздзейнічаць на фарміраванне ў моладзі сучаснага палітычнага і эканамічнага мыслення, умення па-дзяржаўнаму думаць і дзейнічаць, выхоўваць высокую маральную культуру, палітычную стойкасць і непрымірымасць да ўсіх форм буржуазнай ідэалогіі.

Належыць ажыццявіць вялікую работу па павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў, умацаванню іх сувязі з практыкай, прыняць меры па больш поўнаму выкарыстанню вынікаў навуковых даследаванняў у выкладчыцкай рабоце.

Так разумее сваю задачу калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна — флагмана вышэйшай школы рэспублікі. Іменна так, у рытме часу імкнецца працаваць партыйная арганізацыя універсітэта, якая налічвае ў сваіх радах больш чым 1,5 тысячы камуністаў.

ВЫКОНВАЮЧЫ пастанову бюро ЦК КПБ, партыйная арганізацыя універсітэта, яе партыйны камітэт канцэнтруюць сваю ўвагу на вузлавых праблемах вучэбна-выхаваўчага працэсу, перш за ўсё на праблемах яго інтэнсіфікацыі, мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў, максімальнага выкарыстання дасягненняў навукі ў вучэбным працэсе. Асаблівая ўвага надаецца стварэнню творчых адносін у студэнцкіх калектывах, індывідуалізацыі працэсу навучання.

Як падкрэсліў дакладчык, партыйным камітэтам, рэктаратам багата зроблена па ўмацаванню ўзаемасувязі паміж кафедрамі і адпаведнымі падраздзяленнямі інстытутаў. Лічыцца цалкам апраўдаўшым сябе вопыт узаемасувязі паміж кафедрамі і лабараторыямі хімічнага факультэта і НДІ фізіка-хімічных праблем. Стварэнне вучэбна-навуковага аб'яднання «НДІ ФХП — хімічны факультэт» з'явілася завяршальным этапам па стварэнню адзінага арганізма. Няма такіх пытанняў дзеянняў кафедраў і лабараторый інстытута, якія б не вырашаліся сумесна.

У рабоце фізічнага, радыёфізічнага факультэтаў, НДІ прыкладных фізічных праблем і СКТБ аднак усё яшчэ няма такой зладжанасці, няма каардынацыі сумесных работ. Некаторыя з кафедраў гэтых факультэтаў супрацоўнічаюць з лабараторыямі інстытута і аддзеламі СКТБ, многія вядучыя супрацоўнікі інстытута вядуць выкладчыцкую работу. Аднак сказаць, што мы маем справу з адзіным вучэбна-навуковым цэнтрам, нельга. Пакуль што толькі эпізадычна, фрагментарна, на асабістых кантактах кіраўнікоў кафедраў і лабараторый выкарыстоўваецца навуковая база НДІ з вучэбнымі мэтамі. Гэта не што іншае, як безгаспадарчасць, ігнараванне аднаго з асноўных рэзерваў універсітэта ў справе павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў. Думаецца, што настаў час стварыць структуру, якая б у дастатковай ступені каардынавала гэту работу.

Вялікі рэзерв паляпшэння дзейнасці універсітэта закладзены ва ўдасканаленні і пашырэнні ўсіх форм мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Універсітэт назапасіў пэўны вопыт падрыхтоўкі кадраў па прамых сувязях з вытворчасцю, установамі навукі і культуры. У справаздачны перыяд партыйны камітэт і рэктарат правялі вялікую работу па стварэнню новых вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў і ўдасканаленню работы тых, што ўжо дзейнічаюць. Умацоўваецца аб'яднанне «БДУ — «Інтэграл», у 1984 годзе створана аб'яднанне «БДУ — «Гранат», літаральна напярэдадні канферэнцыі створана аб'яднанне «БДУ—«Планар». У адпаведнасці з з дагаворам аб супрацоўніцтве ў межах ВНВА «БДУ — «Інтэграл» універсітэт плануе падрыхтаваць у XII пяцігодцы для аб'яднання 1100 спецыялістаў па радыёфізіцы, электроніцы, фізіцы, хіміі. Неабходна далей праводзіць гэту работу і ў адпаведнасці з рашэннем аднаго з нашых партыйна-гаспадарчых актываў на працягу 1985-86 гадоў стварыць аб'яднанне універсітэта з Белома і НДІ ЭВМ. Жыццё паказала, што праца ў межах аб'яднанняў дапамагае універсітэту не толькі мэтанакіравана рыхтаваць спецыялістаў і ўдасканальваць матэрыяльна-тэхнічную базу, але і канцэнтраваць намаганні прафесарска-выкладчыцкага саставу на рашэнне важнейшых прыкладных задач, у якіх зацікаўлена народная гаспадарка рэспублікі і краіны.

Зараз відавочна, што цэнтр намаганняў у вучэбнай рабоце па цэламу шэрагу спецыялізацый неабходна перанесці ў бок прадпрыемстваў, устаноў горада, рэспублікі. Гэты аспект вучэбнага працэсу будзе пастаянна ўзмацняцца. Значыць, трэба ствараць на прадпрыемствах паўнацэнныя філіялы кафедраў, вучэбна-лабараторныя цэнтры, у якіх, дарэчы, маглі б праходзіць перападрыхтоўку і супрацоўнікі самога прадпрыемства, установы. Зараз універсітэт мае толькі тры такія, прама скажам, слабыя філіялы і ні аднаго вучэбна-лабараторнага цэнтра (маецца на ўвазе, які працаваў бы толькі на вучэбны працэс).

І партыйнаму камітэту, і рэктарату трэба пастаянна назапашваць станоўчы вопыт сувязі універсітэта з прадпрыемствамі рэспублікі, пры гэтым рабіць упор на дасягненне паўнацэннай двухбаковай сувязі прадпрыемстваў з універсітэтам.

МАГЧЫМАСЦІ забеспячэння сучаснага ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста, нашы асноўныя рэзервы ў многім, калі не ва ўсім, вызначаюцца зместам канкрэтнай работы калектываў нашых кафедраў.

Шэраг калектываў універсітэта, сярод якіх можна назваць кафедры фізікі паўправаднікоў, ядзернай фізікі, метадаў аптымальнага кіравання, неарганічнай хіміі, глебазнаўства і геалогіі, беларускай літаратуры, гісторыі СССР дагістарычнага перыяду, марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, гісторыі журналістыкі і іншыя займаюць вядучыя пазіцыі па ўсіх раздзелах дзейнасці кафедраў. Такія кафедры і ствараюць той запас трываласці універсітэта, які дазваляе яму насіць імя флагмана вышэйшай школы рэспублікі.

Разам з тым, нямала кафедраў, якія ўсё яшчэ не могуць устаць на ногі ці ўжо страцілі вядучыя пазіцыі ў сваёй галіне ведаў. Для такіх калектываў уласцівы нізкі ўзровень навуковых даследаванняў, нізкая эфектыўнасць работы аспірантуры, адсутнасць сувязей з вядучымі НДІ і вытворчасцю і шэраг іншых паказчыкаў.

Зараз відавочна, што неабходна пашпартызаваць кафедры, як сёння па ўсёй краіне ідзе пашпартызацыя кожнага рабочага месца. Кіраўніцтва універсітэта, факультэтаў павінна яскрава ўяўляць сабе становішча кожнай кафедры, яе перспектывы, цяжкасці, шляхі ўдасканалення дзейнасці.

Далей дакладчык адзначыў, што створаны нядаўна навукова-тэхнічны савет павінен узяць пад асаблівы кантроль пытанні каардынацыі навукі ва універсітэце. У прыватнасці, пытанні стварэння унутрыуніверсітэцкіх праграм часовых творчых калектываў, тым самым больш уплываць на развіццё навукі і прыкладных даследаванняў, а значыць, і на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй.

У дакладзе падкрэслівалася, што вучонымі універсітэта распрацаваны і створаны пакуль лепшыя ў краіне аўтаматызаваныя сістэмы навучання. Тры класы, абсталяваныя такімі сістэмамі, паспяхова функцыяніруюць у БДУ з 1979 года. Апошнія распрацоўкі такіх сістэм укаранёны ў вучэбны працэс шэрагу ВНУ краіны. У 1984 годзе калектыву супрацоўнікаў на чале з камуністам А. Ф. Чарняўскім за распрацоўку, стварэнне і ўкараненне ў вучэбны працэс АНС прысуджана прэмія Савета Міністраў СССР.

Важнай на сённяшні дзень з'яўляецца праблема — наладзіць серыйны выпуск такіх сістэм, што аказалася далёка не простай справай, якая выходзіць за сферы кампетэнцыі універсітэта і МінВНУ. Мэтазгодна было б даручыць аднаму з галіновых навукова-вытворчых аб'яднанняў вопытна-канструктарскую распрацоўку, укараненне і абслугоўванне АНС на базе мікраЭВМ для прадпрыемстваў і школ рэспублікі. Неабходна ўлічваць, што аўтаматызаваныя навучальныя сістэмы на базе ЭВМ незамянімыя для хуткай і масавай перападрыхтоўкі вытворчых кадраў.

ДАЛЕЙ дакладычк спыніўся на пытаннях ажыццяўлення школьнай рэформы. Неабходна адзначыць, што ў ажыццяўленне школьнай рэформы універсітэт уносіць важкі ўклад. Нашы вучоныя толькі за справаздачны перыяд выдалі 23 школьныя падручнікі; камсамольскія арганізацыі факультэтаў універсітэта шэфствуюць над 27 школамі горада Мінска, працуюць у дзіцячых дамах педагагічныя атрады. Ва універсітэце функцыяніруюць школы юных, вячэрнія і завочныя падрыхтоўчыя курсы.

Належыць, аднак, інтэнсіфікаваць усе аспекты нашай дзейнасці па выкананню школьнай рэформы. І галоўным у гэтым павінна быць умацаванне педагагічнай накіраванасці вучэбнага працэсу, арганізацыя эфектыўнай вытворчай практыкі, максімальнае выкарыстанне ў вучэбным працэсе камп'ютэрнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў навучання. Перад партыйным бюро факультэтаў і дэканатамі стаіць неадкладная задача па аб'яднанню ўсёй працы, што звязана са школай, у адзіны гадавы цыкл, дакладнай яе каардынацыі і рэгламентацыі.

У гэтай сувязі патрабуецца значная рэарганізацыя кафедраў педагогікі і псіхалогіі. Зараз яны, на жаль, не ў стане узяць на сябе каардынацыю ўсіх форм работы універсітэцкага калектыву па школьнай рэформе, па ўмацаванню педагагічнай накіраванасці вучэбнага працэсу. Наспела неабходнасць стварыць кафедру педагогікі, якая будзе спецыялізавацца на метадычным забеспячэнні камп'ютэрнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Партыйны камітэт ужо ставіў гэта пытанне, зараз яго трэба вырашаць.

Праблему паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу партыя разглядае як галоўны напрамак сваёй эканамічнай стратэгіі, асноўны рычаг інтэнсіфікацыі народнай гаспадаркі і павышэння яе эфектыўнасці. Гэта з асаблівай сілай падкрэсліваецца ў праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС.

Наш універсітэт уносіць значны ўклад у падрыхтоўку кадраў для навукі. Вось чаму усе нашы дасягненні і недахопы ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў мы павінны разглядаць праз прызму паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта адзін бок пытання.

Другі бок — наколькі эфектыўнае наша кіраўніцтва навукова-даследчай працай, наколькі эфектыўна мы садзейнічаем навуковым калектывам, асобным вучоным у паспяховым вырашэнні пастаўленых перад імі задач. Гэтыя пытанні дэталёва абмяркоўваліся на двух партыйных актывах, расшыраным пасяджэнні партыйнага камітэта, 6 разоў выносіліся на пасяджэнні бюро парткома.

Вядома, умовай якаснага і хуткага вырашэння праблем паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу з'яўляецца падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі — доктараў і кандыдатаў навук.

Кадравы патэнцыял універсітэта дастаткова высокі. У БДУ працуе 2 акадэмікі, 4 члены-карэспандэнты АН БССР, больш чым 100 доктараў і каля 1000 кандыдатаў навук. Усяго навукай займаецца больш чым 2300 навуковых і навукова-педагагічных супрацоўнікаў.

Выклікае трывогу, аднак, становішча спраў з рэзервам кадраў вышэйшай кваліфікацыі ўсіх узроўняў кіраўніцтва нашай навукай і перш за ўсё кіраўніцтва кафедрамі. Прычым выклікае трывогу ў гэтым пытанні бліжэйшае будучае. У нас сярэдні ўзрост прафесара, доктара навук — 58 гадоў, дацэнта, кандыдата навук — 48—49 гадоў... Больш адной трэці прафесараў і доктараў навук маюць пенсійны ўзрост. Дрэнныя ў гэтым сэнсе справы на гістарычным, геаграфічным факультэтах, факультэце журналістыкі. Шэсцьдзесят са 108 кафедраў універсітэта ўзначальваюць кандыдаты навук.

Такое становішча спраў яскрава адлюстроўвае недапрацоўку партыйнага камітэта, рэктарата на працягу значнага (10 —15 гадоў) перыяду ў кадравым пытанні і перш за ўсё у пытанні падрыхтоўкі доктараў па асноўных напрамках



# З ПРАКТЫКАЙ

універсітэцкай навукі, па асноўных спецыялізацыях.

Партыйны камітэт і рэктарат за справаздачны перыяд прыклалі шмат намаганняў для выпраўлення сітуацыі. Перш за ўсё адабрана больш чым 100 перспектыўных кандыдатаў навук, здольных; на думку іх кіраўнікоў, стаць у бліжэйшыя 5—10 гадоў доктарамі. Партыйны камітэт, рэктарат павінны пастаянна трымаць іх у полі зроку.

Думаючы аб перспектыве падрыхтоўкі доктараў навук, трэба ў пэўнай ступені павысіць эфектыўнасць працы аспірантуры. А яна пакуль яшчэ нізкая. У 1983 годзе са 176 аспірантаў, што скончылі навучанне, толькі 16 абаранілі дысертацыі і 49 прадставілі іх да абароны. Інакш кажучы, лічыцца, што паспяхова скончылі аспірантуру 37 працэнтаў, на самой жа справе — толькі 10 працэнтаў аспірантаў. У 1984 годзе працэнт паспяхова скончыўшых аспірантуру склаў 2. Абаранілі дысертацыі ў тэрмін толькі 15 працэнтаў.

Для павышэння эфектыўнасці дзейнасці аспірантуры неабходна дакладная каардынацыя двух аддзелаў: вучэбнага і аспірантуры. Рэктаратам, дэканатам, кафедрам неабходна ў адносінах будучых аспірантаў аб'яднаць у адзіны навукова-вытворчы цыкл пераддыпломную практыку, дыпломнае праектаванне і працу над кандыдацкай дысертацыяй; на лепшых кафдерах гэта сістэма апраўдвае сябе. Больш строга трэба ставіцца да тых кіраўнікоў, а яны, на жаль, у нас ёсць, у якіх выхад аспірантаў нязначны, роўны нулю.

Адной з перашкод на шляху паспяховага завяршэння аспірантуры з'яўляецца адстунасць публікацый, што часцей за ўсё абумоўлена працяглай працэдурай друкавання матэрыялаў у саюзных і рэспубліканскіх выданнях.

Думаецца, у справе падрыхтоўкі кандыдатаў навук мы слаба выкарыстоўваем наш друкаваны орган — часопіс «Веснік Белдзяржуніверсітэта». Рэдакцыйным калегіям, рэдакцыі неабходна аддаць перавагу ў публікацыі матэрыялаў, перш за ўсё, нашым аспірантам. Часопіс слаба выконвае функцыі весніка БДУ, не выкарыстоўваецца як трыбуна перадавой думкі, абмену вопытам, ён проста нецікавы для шырокага кола чытачоў. Таму кожны год мы з цяжкасцю «выцягваем» падпіску.

Савету, рэктарату універсітэта неабходна карэнным чынам перабудаваць работу ў адносінах да нашага «Весніка», зыходзячы з таго, што ён — адзін з фактараў падрыхтоўкі кадраў, развіцця навукі, нарэшце — адлюстраванне гісторыі навуковай думкі нашага універсітэта.

ВУЧОНЫМІ выконваюцца заданні 74 саюзных, рэспубліканскіх і галіновых праграм па 167 тэмах. Большая частка навуковых даследаванняў, што праводзяцца вучонымі універсітэта, адносіцца да фундаментальных. З гэтага года універсітэт з'яўляецца галаўной арганізацыяй дзвюх комплексных саюзных праграм у галіне фізікі, інакш кажучы, каардынатарам навуковых даследаванняў вялікіх калектываў краіны. Гэта прызнанне аўтарытэту універсітэцкіх навуковых школ.

Асабліва трэба адзначыць кафедру марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў. Загадчык — камуніст В. С. Сцёпін. Калектыў кафедры па ўмовах сацыялістычнага спаборніцтва на працягу шэрагу апошніх гадоў аднаЗначна займае першае месца сярод кафедраў грамадскіх навук, назапасіў вялікі вопыт вучэбна-выхаваўчай работы, мае высокія навуковыя дасягненні. Усе супрацоўнікі кафедры маюць вучоныя ступені. Ужо можна казаць аб тым, што ва універсітэце створана прызнаная ў краіне філасофская школа. Трывалыя пазіцыі ўтрымлівае кафедра гісторыі КПСС, якую ўзначальвае прафесар У. К. Коршук.

Ва універсітэце скла́ліся арыгінальныя навуковыя школы ў галіне фізікі, матэматыкі, хіміі, прыладабудавання.

Потым дакладчык падкрэсліў, што партыйны камітэт і рэктарат надаюць вялікую ўвагу пытанням выхаду фундаментальных даследаванняў у практыку, укаранення навуковых дасягненняў. Як вынік — значна павысілася эфектыўнасць НДР. Напрыклад, калі ў 1980 годзе былі ўкаранёны ў народную гаспадарку 102 навукова-даследчыя работы, то ў 1983 годзе — 141, у 1984 годзе — 205.

Эканамічны эфект ад укаранення НДР штогод складае больш чым 20 мільёнаў рублёў. У 1984 годзе ўкаранёна 89 вынаходніцтваў (у 1983 г.— 65). Выдадзены 284 манаграфіі і зборнікі навуковых прац, апублікавана каля 3,5 тысячы артыкулаў.

Многія работы прыкладнога характару агульнавядомыя, яны атрымалі прызнанне навуковай грамадскасці рэспублікі і краіны. Высокага ўзроўню навуковыя даследаванні дасягнулі ў НДІ прыкладных фізічных праблем. Асабліва неабходна адзначыць высокую якасць опта- і радыёэлектроннай апаратуры, што ствараецца вучонымі інстытута для аўтаматызацыі шырокага класа фізічных эксперыментаў. Цэлы шэраг распрацовак накіраваны на серыйнае ўкараненне.

Распрацоўваюцца новыя паўправадніковыя матэрыялы для патрэб мікраэлектронікі.

Калектывам на чале з доктарам фізіка-матэматычных навук І. А. Малевічам выкананы цыкл работ па забеспячэнню функцыяніравання робата-тэхнічных сістэм і комплексаў, якія былі ўдастоены ў 1984 годзе Дзяржаўнай прэміі БССР.

Вялікі аб'ём даследаванняў па праблемах фізіка-хімічных асноў матэрыялазнаўства і распрацоўкі канструкцыйных матэрыялаў і прылад новай тэхнікі выконваецца хімікамі універсітэта. Сярод кафедраў у галіне прыкладных даследаванняў прызнаным аўтарытэтам карыстаецца кафедра ядзернай фізікі (загадчык — камуніст С. С. Шушкевіч). Вучонымі кафедры сумесна з нашым СКТБ у апошнія гады выканан комплекс навукова-даследчых і тэхналагічных распрацовак, якія накіраваны на развіццё метадаў магнітна-рэзананснай і гама-рэзананснай спектраскапіі прымяняльна да вырашэння важнейшых народнагаспадарчых задач.

Створаны новы клас спектраметрычнай апаратуры — малагабарытных радыёспектраметраў. Прызначэнне прылад — павышэнне эфектыўнасці пошуку і здабычы карысных выкапняў, аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў, клінічны і лабараторны аналіз рэчываў, матэрыялаў і вырабаў.

У гэтым годзе калектыў супрацоўнікаў на чале з С. С. Шушкевічам за ўказаныя работы ўзнагароджаны прэміяй Савета Міністраў СССР.

Вялікі рэзерв у павышэнні аддачы універсітэцкай навукі ляжыць у каардынацыі дзейнасці навуковых падраздзяленняў, НДІ, факультэтаў з нашым СКТБ. На жаль, сёння гэта адно з нявырашаных пытанняў. Таму першаступенная задача партыйнага камітэта, рэктарата, НДЧ кіраўніцтва інстытутаў, факультэтаў, СКТБ — глыбока разабрацца ў сітуацыі, якая склалася, прывесці ў працаздольнае становішча адзін з асноўных рэзерваў павышэння выхаду універсітэцкай навукі на практыку.

Застаецца ў сіле праблема ўзбуйнення тэматыкі. Ва універсітэце выконваюцца 453 навукова-даследчыя работы. Шлях узбуйнення тэматыкі адзін — працаваць у рамках вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў па прамых сувязях з буйнымі прадпрыемствамі рэспублікі. Пры кампетэнтным кіраўніцтве навукай універсітэта задачу ўзбуйнення тэматыкі можна вырашаць паспяхова.

УСЯ НАША партыйная работа і асабліва яе канчатковы вынік маюць прамы выхад на камсамол. Умова паспяховай працы камсамольскай арганізацыі — пастаянная, дакладная работа партыйных бюро з камсамольскімі кадрамі, штодзённая ўвага кіраўнікоў факультэтаў, кафедраў, камуністаў да камсамольскіх актывістаў.

Тут партыйнаму камітэту універсітэта, партыйным бюро факультэтаў ёсць над чым працаваць. Сацыялагічныя даследаванні, практыка пацвярджаюць трывожны факт, што ў апошні час зніжаецца аўтарытэт камсорга як галоўнага арганізатара і кіраўніка камсамольскага жыцця ў групе. Вывад адзін — камсоргамі выбіраюцца не заўсёды лідэры ў поўным сэнсе гэтага слова. Сведчанне таму: летась з 385 камсоргаў 29 не справіліся з абавязкамі і былі перавыбраны да тэрміну, 15 атрымалі спагнанні. Справу трэба папраўляць. Партыйным бюро факультэтаў, дэканатам неабходна значна палепшыць работу з камсамолам, не будаваць яе аднабакова, шляхам указанняў, натацый, перадаручэнняў розных спраў, як гэта часта бывае. Фрагментарны падыход да справы выхавання ніколі не прынясе жадаемага выніку.

Нам неабходна працягваць работу па развіццю студэнцкага самакіравання. На сённяшні дзень становішча студэнцкага самакіравання адстала ад жыцця, фактычна садзейнічае таму, што студэнты перакладваюць паўнату адказнасці за вучобу, быт і адпачынак на выкладчыкаў, кіраўніцтва, тэхнічны персанал.

Партком не здымае і з сябе адказнасці за слабыя дзеянні студэнцкага самакіравання. Сектар работы ў інтэрнатах не справіўся з праблемай пераводу аднаго з інтэрнатаў на самаабслугоўванне. Гаварылася шмат, аднак далей размоў справа не пайшла.

Як адзначалася ў дакладзе, партыйная арганізацыя універсітэта валодае вопытным атрадам ідэалагічных работнікаў, здольных прафесійна, ва унісон сучасным патрабаванням вырашаць праблемы выхавання нашай моладзі.

Вялікая праца ў справаздачным перыядзе праароблена партыйным камітэтам па адраджэнню і ўмацаванню традыцый універсітэта. Шмат зроблена па ўдасканаленню дзейнасці такіх традыцыйных мерапрыемстваў, як дзень ведаў, дзень факультэта, дзень выпускніка, дзень адчыненых дзвярэй, студэнцкія канферэнцыі.

Партком развіваў працэс класавай загартоўкі студэнтаў, выпрацоўкі ўстойлівага імунітэту супраць успрыняцця буржуазнай прапаганды і маралі. У 1984 годзе пры парткоме створаны сацыялагічны цэнтр па вывучэнню грамадскай думкі, камісія па контрпрапагандзе, пры кафедрах грамадскіх навук функцыяніруюць дыскусійныя клубы для савецкіх і замежных студэнтаў, арганізуюцца палітычныя дыскусіі з моладдзю капіталістычных краін, дыялогі, мітынгі з удзелам замежных студэнтаў і г. д. У сістэме сродкаў фарміравання гарманічнай асобы, маральна-эстэтычнага выхавання вялікая ўвага надаецца развіццю самадзейнай творчасці.

Партком умацаваў кадрамі, зрабіў практычныя крокі па канкрэтызацыі работы таварыства «Веды», савета куратараў, савета па атэізму, савета прафілактыкі; разгортвае сваю дзейнасць савет добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць. Мяняецца да лепшага стыль работы ўсіх грамадскіх арганізацый і фарміраванняў.

Разам з тым, як падкрэсліў дакладчык, партыйны камітэт не мае дастаткова простай, перакана́ўчай, дзейснай сістэмы ацэнкі вучэбна-выхаваўчай работы; сістэма ацэнак вучэбнай работы і сістэма ацэнак выхаваўчай работы існуюць асобна, хутчэй толькі ў лічбах колькасці мерапрыемстваў, часам без уліку іх якасці.

У нас ёсць шмат выдатных педагогаў-выхавацеляў. Аднак мы не можам даць аб'ектыўнай ацэнкі іх працы, тым самым прыніжаем іх уклад у агульную справу выхавання студэнтаў. Значыць, мы не можам аргументаваць неабходным чынам тое ці іншае кадравае пытанне. Скажам, пры назначэнні на пасаду загадчыка кафедрай, лабараторыяй, аддзелам.

Мы пачалі запаўняць прабел у сістэме ацэнак выхаваўчай работы правядзеннем сацыялагічных даследаванняў. Аднак тут таксама патрэбна дакладная, разумная сістэма карыстання вынікамі. У гэтым пытанні і партыйны камітэт. і рэктарат можна лічыць толькі на пачатку шляху.

Вучоныя універсітэта распрацавалі комплексную праграму навучання і выхавання студэнта на 5 гадоў, у якой ёсць усе аспекты вучэбна-выхаваўчай работы. Праграма ўкаранёна ў вучэбна-выхаваўчы працэс многіх ВНУ рэспублікі і краіны. Іменна гэтая праграма можа стаць фундаментам вучэбна-выхаваўчай работы пры ўмове, што мы зможам удыхнуць у яе жыццё, канкрэтнасць у прымяненні да кожнага факультэта, да кожнага мерапрыемства.

Потым дакладчык сказаў, што, як сведчыць статыстыка, большасць парушальнікаў дысцыпліны, законнасці ў нашым калектыве былі прадастаўлены самі сабе. Яны выпалі з поля зроку грамадскіх арганізацый, куратараў, дэканатаў.

Паслабленае выхаваўчае ўздзеянне прыводзіць да прамога браку ў нашай рабоце. Значны працэнт выключаных студэнтаў на гістарычным, механіка-матэматычным, фізічным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі. Вялікая доля адказнасці за невыкананне універсітэтам плана выпуску спецыялістаў, а план універсітэт не выконвае 2 гады запар, кладзецца на гэтыя калектывы.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС аб выкарыстанні клубных устаноў і спартыўных збудаванняў неабходна стварыць на кожным факультэце студэнцкія клубы, аб'яднаўшы ў іх арганізацыю быту, адпачынку, заняткі масавым спортам. Патрэбна стварыць умовы для развіцця студэнцкай абраднасці: правядзенне дзён нараджэння, камсамольскіх вяселляў і г. д. Гэтая важная справа ўсё яшчэ знаходзіцца ў планавым становішчы.

Значным рэзервам у справе паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы з'яўляецца павышэнне ролі грамадскіх арганізацый, якія мы часам недаацэньваем. Як, прынамсі, часам недаацэньваем у справе павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і фактар грамадскай работы ў цэлым. Таму партыйны камітэт, рэктарат з'яўляюцца вельмі часта арганізатарамі мерапрыемстваў, якія маглі б з большым поспехам і з большай карысцю праводзіць грамадскія арганізацыі, самі студэнты.

У заключэнне дакладчык выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна новымі працоўнымі перамогамі, новымі здзяйсненнямі сустрэне XXVII з'езд КПСС, зробіць усё, каб ажыццявіць яго рашэнні.

## Партком універсітэта

У састаў парткома універсітэта выбраны В. В. Альсевіч, Л. А. Аркадзьеў, В. В. Беспразванны, В. П. Вараб'ёў, В. А. Гайсёнак, А. М. Гурко, А. М. Дземяшкевіч, Г. І. Драгун, М. Я. Зайцаў, А. У. Зінкевіч, Л. А. Залатарэвіч, А. С. Каспяровіч, Л. І. Кісялеўскі, М. І. Казлоўскі, А. У. Казулін, У. К. Коршук, В. У. Краснапрошын, Л. Ф. Кузняцова, Т. М. Кузьмінава, В. І. Корзюк, Г. В. Мацвееў, С. Р. Мулярчык, Л. М. Аўсянка, І. І. Пірожнік, М. Р. Прыгодзіч, В. А. Прокашава, М. В. Рожын, А. М. Рухля, В. М. Сідзерка, А. Г. Слука, В. Г. Ціхіня, У. М. Чарнагузаў, А. Ф. Чарняўскі, М. Э. Часноўскі, М. І. Юрчук.

Адбыўся арганізацыйны пленум партыйнага камітэта. Сакратаром парткома і членам бюро выбраны М. І. Юрчук, намеснікамі сакратара парткома і членамі бюро — В. А. Прокашава і А. Г. Слука. Старшынёй парткамісіі і членам бюро выбраны А. М. Рухля. Членамі бюро выбраны В. А. Гайсёнак, М. Я. Зайцаў, А. С. Каспяровіч, Л. І. Кісялеўскі, А. У. Казулін, У. К. Коршук, Л. М. Аўсянка.

## ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# КАБ РАСЛА ДАСТОЙНАЯ ЗМЕНА

**Пяцімільённы атрад студэнцтва — гэта тая сіла, якой належыць ажыццяўляць планы партыі. Студэнты разумеюць гэта і рэальна ацэньваюць перадз'ездаўскія дакументы.**

## СТУДЭНТ І НАВУКА

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ прыкладной матэматыкі працуюць 3 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі і 11 навуковых гурткоў. Шмат студэнтаў прымае актыўны ўдзел у выкананні гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работ на кафедрах. Звыш 20 чалавек штогод з'яўляюцца байцамі студэнцкага навуковага атрада. Студэнты з вялікай цікавасцю далучаюцца да навукова-вытворчай дзейнасці аб'яднанняў «БДУ — НДІ ЭВМ», «БДУ — «Інтэграл», «БДУ – «Планар».

Нягледзячы на шэраг дасягненняў, маюцца ў нас яшчэ і значныя недахопы, пазбавіцца ад якіх можна толькі, калі выключыць фармальны падыход да гэтай важнай справы.

Адсутнічае рэальная і эфектыўная навукова-метадычная сістэма фарміравання ў студэнтаў навыкаў творчай працы на працягу ўсяго тэрміну навучання. На жаль, пакуль яшчэ ў баку застаецца наш вучэбна-метадычны цэнтр. Загадчыкі кафедрамі і дэканат факультэта, а таксама кіраўнікі грамадскіх арганізацый пакуль яшчэ мала цікавяцца работай навуковых студэнцкіх фарміраванняў.

Напрыклад, вось ужо 2 гады на факультэце існуе студэнцкі навуковы атрад. Ідэя стварэння такога аб'яднання прадугледжвала калектыўную працу студэнтаў над распрацоўкай і укараненнем вытворчай задачы пад кіраўніцтвам вопытнага выкладчыка ці работніка вылічальнага цэнтра. На самой жа справе студэнты ўладкоўваюцца на стаўкі па 2—3 чалавекі на прадпрыемствы ў розныя аддзелы. Які ж гэта атрад? Студэнтам тэрмінова патрэбна дапамога. І хаця гэта пытанне абмяркоўвалася і на партсходзе факультэта, і на парткоме універсітэта, але зрухаў пакуль няма.

Студэнтам неабходна адчуць рэальны вынік сваёй працы. Але чамусьці ім баяцца даверыць адказны ўчастак, забываюць, што студэнты заўтра будуць кіраўнікамі на вытворчасці. І таму неабходна загадзя даручаць ім новыя, смелыя даследаванні, якія б абуджалі прагу да творчасці, самастойнай працы. Нам неабходна падтрымліваць гэтую ініцыятыву, накіроўваць яе, даваць адчуць маладому даследчыку, што ён з'яўляецца першапраходцам у гэтым даследаванні.

Пасля выхаду ў свет вядомых пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб развіцці сродкаў вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм кіравання, рабатызацыі і аўтаматызацыі вытворчасці мы адчуваем новыя перспектыўныя зрухі і практычныя змены ў арганізацыі вучэбнага працэсу, якія накіраваны у першую чаргу на насычэнне вучэбных праграм практычнымі раздзеламі сучаснай аўтаматызаванай вытворчасці, камп'ютэрызаванай тэхналогіі, тэорыі сістэм аўтаматызаванага праектавання.

Студэнты факультэта прыкладной матэматыкі адчуваюць вострую неабходнасць практычнага замацавання набытых тэарэтычных ведаў з мэтай больш хуткай адаптацыі на месцах будучай працы. Аднак за 5 год вучобы мы не мелі магчымасці паспрабаваць сябе на ЕС-ЭВМ, міні- і мікравылічальнай тэхніцы ў выніку недахопу машыннага часу для выканання разлікаў па практычных і лабараторных занятках.

Далёка не ўсе студэнты факультэта маюць доступ да дысплейных класаў і кабінетаў мініЭВМ, не кажучы ўжо аб персанальных камп'ютэрах, тэрмінальным і дысплейным абсталяванні.

Некалькі радкоў аб сацыялістычным спаборніцтве па студэнцкай навуцы. Адной з умоў з'яўляюцца публікацыі лепшых работ, за іх налічваюць высокія балы. Але змясціць вынікі даследаванняў не так проста. Возьмем да прыкладу «Веснік БДУ». Паспрабуйце знайсці там студэнцкую публікацыю! А што казаць аб рэспубліканскіх і саюзных часопісах? Умовы нерэальныя. Публікацыі фактычна не залежаць ад магчымасцей студэнтаў. Таму трэба ці ўвогуле адмовіцца ад гэтага пункту, ці стварыць больш спрыяльныя ўмовы і аказваць рэальнае садзеянне. Напрыклад, друкаваць лепшыя працы студэнцкай канферэнцыі на ратапрынце.

Адзін раз у год студэнтам прадастаўляецца магчымасць абмену вопытам навукова-даследчай работы з блізкімі факультэтамі розных ВНУ у час правядзення ва ўсіх вучэбных установах навуковых канферэнцый. Афарміць камандзіроўку студэнты нашага факультэта літаральна не маюць магчымасці.

І ў заключэнне хочацца сказаць яшчэ аб адной важнай праблеме. Вядома, што некаторыя факультэты адчуваюць недахоп аўдыторнага фонду. Але ў самым незайздросным становішчы знаходзіцца наш факультэт. Часам прыходзіцца займацца ва ўсіх пяці карпусах універсітэцкага гарадка. І як бы ні стараліся размеркаваць аўдыторыі, аднак усё ж многія вучэбныя групы ў перапынках між парамі пераходзяць з аднаго корпуса ў другі па два разы на дзень. Асабліва нязручна гэта ў зімні час.

Вырашэнне вышэйназваных праблем значна павысіць якасць вучэбнага працэсу і прафесійнай падрыхтоўкі.

**Л. ПАНЧАНКА,**
**студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі.**

# ЖЫЦЦЁВАЙ ПАЗІЦЫІ — АКТЫЎНАСЦЬ

## ВЫХАВАННЕ: КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД

***Праграма партыі — праграма стваральная. І размова ў ёй ідзе не толькі аб вытворчасці матэрыяльных даброт, а і аб фарміраванні асобы чалавека будучага грамадства. Таму кожны камуніст, кожны савецкі чалавек, які вывучае праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС, павінен перад сабой паставіць пытанне: што я магу і што павінен зрабіць асабіста, каб намечанае партыяй было ажыццёўлена?***

***Чым больш грунтоўна мы будзем разбірацца ў тым, як фарміруецца асоба, які ўплыў яна аказвае на калектыў і ўвогуле на ход нашага жыцця, тым хутчэй зможам актывізаваць чалавечы фактар. А іменна ён з'яўляецца ключом да вырашэння многіх сацыяльна-эканамічных праблем.***

У СУВЯЗІ з гэтым вялікія задачы стаяць перад намі — работнікамі вышэйшай школы. Належыць удасканальваць формы навучання, распаўсюджваць тыя, што актывізуюць студэнта, прымушаюць самастойна думаць, адстойваць свае ідэі, дамагацца, каб веды і свядомасць вызначалі стыль жыцця моладзі.

Праслухаць лекцыю, адказаць на пытанне, што задаў выкладчык, здаць залік ці экзамен — усяго гэтага відавочна недастаткова, каб веды ператварыліся ў перакананні. Чаму? Думаецца, адказ трэба шукаць не толькі ў формах і метадах выкладання.

У сучасных умовах адказ на гэтае пытанне набывае першаступеннае значэнне як з пункту гледжання нашага ўнутраннага развіцця, так і ў барацьбе з буржуазнымі фальсіфікатарамі. Неабходна аб'яднаць намаганні прадстаўнікоў розных навук для распрацоўкі тэорыі фарміравання перакананасці. Як вядома, перакананнямі становяцца толькі тыя веды, што з'яўляюцца ўласным здабыткам чалавека, неад'емнай часткай яго ўнутранага свету. Аднак сярод нашых студэнтаў нямала людзей інфантыльных і бязвольных. Значная частка моладзі паступае ва універсітэт не па схільнасці, не у адпаведнасці з прафесійнымі і грамадзянскімі матывамі, а толькі таму, што жадае атрымаць вышэйшую адукацыю.

З гэтай нагоды нам неабходна ўдасканальваць прафесійную арыентацыю навучэнцаў школ і ПТВ, больш патрабавальна падыходзіць да тых, каго рэкамендуем у ВНУ. Вось ужо трэці год ажыццяўляецца мэтавы прыём на аддзяленне гісторыі КПСС. Адпаведна існуючага палажэння сюды неабходна прымаць камуністаў, і толькі ў выключных выпадках камсамольцаў, якія добра сябе зарэкамендавалі. Аднак за прайшоўшы час выключэнне стала правілам.

Варта адзначыць, што такое ж становішча з накіраваннем на грамадазнаўчыя аддзяленні і па другіх кафедрах універсітэта. Удасканалення патрабуе і наша праца з аспірантамі. Калі студэнтам для паступлення патрабуецца рэкамендацыя абкома партыі, то для паступлення па гэтых жа спецыяльнасцях у аспірантуру гэта чамусьці не прадугледжана. У выніку сюды па мэтавых накіраваннях ВНУ ідуць не заўсёды лепшыя. Не трэба забываць, што гэта будучыя выхавацелі, ад якіх залежыць вельмі многае.

Кожным сваім радком праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС накіраваны на актывізацыю чалавечага фактару. Партыя ставіць мэту, каб чалавек выхоўваўся не толькі як носьбіт пэўнай сумы ведаў, а перш за ўсё як грамадзянін сацыялістычнага грамадства, з уласцівымі яму ідэйнымі перакананнямі, мараллю, інтарэсамі, высокай культурай працы і паводзін. Навучанне і выхаванне, выхаванне якасцей прафесійнага работніка і грамадзяніна выступае як адзіны працэс. Кожныя заняткі па любой дысцыпліне, кожная сустрэча са студэнтамі ў аўдыторыі і па-за ёю павінны насіць выхаваўчы характар.

Варта разам з тым адзначыць, што у працэсе вывучэння некаторых прадметаў выхаваўчая функцыя застаецца як бы дадатковай і другараднай. Нават праграмы па шэрагу дасцыплін арыентаваны ў асноўным на загрузку памяці. Партыя ж ставіць задачу арганічнай сувязі ідэйна-выхаваўчай работы з той справай, якой займаецца чалавек.

Пры абмеркаванні на бюро ЦК КПБ універсітэту справядліва было ўказана на неабходнасць распрацаваць асноўныя напрамкі фарміравання светапогляду студэнтаў у працэсе вывучэння ўсіх дысцыплін. Работа гэта у нас вядзецца. Думаецца, аднак, што ў святле новай рэдакцыі партыйнай Праграмы данае пытанне павінна разглядацца шырэй, таму што гэта датычыцца кожнай ВНУ. У сувязі з гэтым у новай рэдакцыі Праграмы варта было б падкрэсліць, што *«фарміраванне ў моладзі палітычных і маральных перакананняў з'яўляецца разам з навучаннем галоўнай задачай вышэйшай школы».*

Такая арыентацыя ў значнай ступені дапамагла б рашэнню не толькі ідэалагічных, але і эканамічных праблем, якія стаяць перад краінай.

Наша задача не толькі развіваць у студэнта здольнасці да самастойнага мыслення, але і фарміраваць у яго дакладныя сацыяльныя пазіцыі, выпрацоўваць у моладзі стратэгію і тактыку жыцця.

Неабходна пастаянна ставіць перад студэнтам новыя праблемы, задачы, пытанні, стымуляваць яго цікавасць да пераадолення цяжкасцей у навуцы і жыцці, выхоўваць навыкі такога пераадолення. Пакуль жа студэнты сарыентаваны часам не столькі на цяжкасці і іх пераадоленне, колькі на ухіленне ад такіх цяжкасцей.

Працэс фарміравання асобы не просты. І нельга не кастатаваць імкненне пэўнай часткі юнакоў і дзяўчат вылучыцца не ведамі і працавітасцю, а каштоўнымі рэчамі, што набыты на грошы бацькоў. Гэта якраз тая частка моладзі, якая задумваецца не над пытаннем «Хто я ёсць?» а над пытаннем «Што ў мяне ёсць?» Пераадоленне падобных негатыўных з'яў — неабходная ўмова фарміравання выхаванага чалавека.

У рашэнні гэтай задачы важную ролю адыгрываюць нашы выхаваўчыя мерапрыемствы. Разам з тым нельга абсалютызаваць іх значэнне, куды больш важныя нашы асабістыя адносіны да справы, да свайго абавязку, наша ацэнка працы добрасумленных і неахайных студэнтаў, арганізацыя вучэбнай практыкі, нашы рэплікі ва ўмовах нефармальных зносін са студэнтамі, работа студэнцкіх будаўнічых атрадаў, выхаванне беражлівасці і нашы беражлівыя адносіны да маёмасці універсітэта.

Карацей кажучы, на фарміраванне жыццёвай пазіцыі студэнтаў вялікі ўплыў аказвае жыццёвая пазіцыя саміх выкладчыкаў. Таму настолькі важная патрабавальнасць да саміх сябе, да нашых калег. Быць неабыякавымі, шчыра хварэць за агульную справу, актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі курса, што вызначыла партыя, — вось задачы, якія стаяць перад кожным з нас.

**У. КОРШУК,**
**загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, прафесар.**



*Першы снег...*
*Фотаэцюд В. ШАЧАКА*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

21 лістапада 1985 г.
Зак. 3159. АТ 13828.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.